# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 7 (285) | ЧАЦВЕР 7 сакавіка 1957 г. | Цана 20 кап.


# ГАЛАСУЮЦЬ СТУДЭНТЫ



Жыццё універсітэцкага гарадка пачалося ў гэты дзень незвычайна рана. Агеньчыкі ў вокнах інтэрната, дзе жывуць студэнты БДУ, свяціліся яшчэ задоўга да 6 гадзін раніцы. Маладыя выбаршчыкі збіраліся першымі аддаць свае галасы.



... Мы ў біялагічным корпусе, дзе будзе праходзіць галасаванне. Да шасці гадзін засталося пятнаццаць мінут, але тут ужо многа выбаршчыкаў, сярод якіх большасць нашых студэнтаў. Члены выбарчай камісіі ўжо на сваіх месцах. (Здымак 2). Першымі прыйшлі сюды студэнткі філалагічнага факультэта Галя Маз, сёстры Ніла і Рыма Яўдакімчык, Галя Меляшэвіч і другія.

Стрэлка гадзінніка набліжаецца да шасці гадзін. Вось ужо прагучэў апошні ўдар маскоўскіх курантаў па радыё. Старшыня выбарчай камісіі т. Майракаў горача віншуе выбаршчыкаў з пачаткам галасавання. Студэнт IV курса фізіка-матэматычнага факультэта Пятро Чарнуха атрымоўвае бюлетэнь ад членаў выбарчай камісіі, таксама студэнтаў, Уладзіміра Шапчыца і Тацяны Руднік (здымак 3). Першы раз у жыцці аддаюць свае галасы студэнткі II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Тамара Шпакова, Соня Касцюшка, Таіса Клімовіч (здымак 1). Разам з імі галасуюць студэнты II курса аддзялення журналістыкі Іван Старавойтаў, Уладзімір Васілевіч.

У гэты дзень многія студэнты першы раз у жыцці прымалі ўдзел у выбарах. Вось галасуюць сябры—студэнты фізіка - матэматычнага факультэта Нікалай Лукашэвіч і Дзмітрый Скутаў (здымак 4). Разам прышлі прагаласаваць і сяброўкі Надзежда Гурын і Зіна Кардаш, студэнткі філалагічнага факультэта. Лік прагаласаваўшых усё расце і расце.



Дружна галасуюць студэнты IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Вось прыйшлі аднакурснікі Касцюковіч, Каган, Левіна, Клышко, Лашутка, Кузьміцкі і другія.

А ў клубе пачынаецца канцэрт калектыву мастацкай самадзейнасці нашага універсітэта. Студэнтаў змяняюць артысты Белдзяржфілармоніі. У агітпункце група выбаршчыкаў сабралася ля тэлевізара.



Да позняга вечара на выбарчым участку не змаўкалі вясёлыя галасы, смех, жарты. Больш за ўсіх весялілася моладзь. І тут першымі былі студэнты.

**І. ШУЦІК,**
**Фото М. Пільшчыкава.**

# XXII НАВУКОВАЯ СЕСІЯ БДУ ПАЧАЛА СВАЮ РАБОТУ

5 сакавіка адкрылася традыцыйная навуковая сесія нашага універсітэта. Сесія гэтага года праходзіць у абстаноўцы працоўнага ўздыму і высокай палітычнай актыўнасці савецкіх людзей, якія ўпэўнена ідуць насустрач 40-ой гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Прайшоўшыя на днях выбары ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных прадэманстравалі цвёрдую згуртаванасць совецкага народа вакол роднай Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада, рашучасць змагацца за канчатковае выкананне праграмы комуністычнага будаўніцтва.

Сярод дэпутатаў, выбраных у Мінскі абласны, гарадскі і Ленінскі раённы Советы ёсць прадстаўнікі і нашага калектыву. Гэта перадавыя вучоныя актыўныя працаўнікі-патрыёты.

Навуковая сесія універсітэта мае шырокую праграму і выклікае вялікую цікавасць у вучоных і студэнцкай грамадскасці. Яна будзе ўключаць пленарныя і секцыйныя пасяджэнні, якія працягнуцца да 11 сакавіка.

На першым пленарным пасяджэнні заслуханы даклады міністра юстыцыі БССР І. Д. Ветрава, «Пашырэнне правоў і павышэнне ролі саюзных рэспублік у дзяржаўным, гаспадарчым і культурным будаўніцтве», прафесара М. М. Паўлючэнкі «Ланцуговыя рэакцыі і іх значэнне», дацэнта Ф. В. Баравіка «Некаторыя пытанні арганізацыі і аплаты працы ў калгасах БССР» і іншыя.

На другім пленарным пасяджэнні будуць заслуханы даклады прафесараў Б. І. Сцяпанава «Спектральны аналіз», Т. Н. Годнева «Навейшыя дасягненні па праблеме фотасінтэза», а таксама падведзены вынікі секцыйнай работы.

У час сесіі працуюць 11 секцый, першыя пасяджэнні якіх пачаліся 6 сакавіка. Так, секцыя фізічных навук абмяркуе праблему паглынання адмоўнага патока інфрачырвонага выпраменьвання, якая распрацоўваецца калектывам вучоных пад кіраўніцтвам прафесара Б. І. Сцяпанава. Тут-жа будуць абмеркаваны даклады прафесара А. Н. Сеўчанкі «Уплыў асяроддзя на люміненсцэнцыю ўранілавых злучэнняў», дацэнта І. З. Фішара «Тэорыя электраправоднасці вадкіх і аморфных поўправаднікоў» і іншыя.

У секцыі матэматыкаў даклады зробяць прафесар Д. А. Супруненка, дацэнты Н. В. Ламбін, А. М. Родаў, А. Е. Турэцкі, Л. К. Тутаеў і другія.

Асноўнае месца ў рабоце секцыі хімікаў зойме абмеркаванне вынікаў даследаваня рэакцый цвёрдых цел і праблемы адсорбцыі арганічных кіслот на лангнінавых вугалях і прырода асяроддзяў.

Не менш цікавая тэматыка ў секцыях грамадскіх навук. Заслугоўваюць увагі даклады філосафаў. Вялікае месца адводзіцца гісторыі развіцця грамадскай думкі ў Беларусі, абмеркаванню катэгорый матэрыялістычнай дыялектыкі.

Значнае месца адводзіцца гісторыі беларускага народа, пытанню будаўніцтва соцыялізма ў краінах народнай дэмакратыі, Кітаі.

Няма сумнення ў тым, што гэтая сесія пройдзе пры актыўным удзеле вучоных і студэнтаў і натхніць іх на новы размах навукова-даследчай работы.

# ДАВАЙЦЕ РАЗАМ ПРАЦАВАЦЬ!

*Зварот радыёзаводцаў да калектыва фізіка - матэматычнага факультэта БДУ*

Пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі наш народ дабіўся выдатных поспехаў у будаўніцтве магутнай, сучаснай прамысловасці. Па тэмпах росту выпуска прамысловай прадукцыі наша краіна не мае роўных сабе ў свеце.

XX з'езд КПСС паставіў перад работнікамі навукі і вытворчасці новыя, грандыёзныя задачы ў справе далейшага росту выпуска прадукцыі, паляпшэння яе якасці, абсталявання вытворчасці новымі машынамі і механізмамі на базе дасягненняў навукі і тэхнікі. Дастаткова сказаць, што ў новай пяцігодцы выпуск радыёпрыёмнікаў і тэлевізараў ўзрасце ў два з палавінай разы.

Усё гэта ставіць перад вучонымі і вытворчымі калектывамі вялікія і пачэсныя задачы. У гэтых умовах яшчэ больш важнае значэнне набывае трывалая і плённая сувязь навукі з вытворчасцю. Калектыў нашага завода, адклікаючыся на гістарычныя рашэнні XX з'езда партыі, прарабіў некаторую работу ў галіне ўкаранення ў вытворчасць новай тэхнікі.

Канструктарскі аддзел нашага завода распрацаваў новы радыёпрыёмнік I класа «Беларусь-57», які ў сучасны момант запускаецца на канвееры зборачнага цэха. У гэтым прыёмніку выкарыстаны новыя поўправадніковыя надстроечныя сардэчнікі ў катушках індуктыўнасці (ферыты), дазволіўшыя пры тых-жа электрычных параметрах атрымаць намнога меншыя па габарытах контурныя катушкі. Пры гэтым выкарыстоўваецца намнога менш медзі і прымяняецца танны провад ПЭЛ, замест дарага каштуючага лідцэндрата. Новыя контурныя катушкі дазволілі сканструяваць мала габарытныя высокачастотныя блокі і фільтры прамежнай частаты. Замест вакумных выпрамляючых лямпаў мы прымянілі поўнаправадніковыя германіевыя дзіоды ДГЦ-24.

У дынамічным гучнагаварыцелю ў нас карэнным чынам зменена магнітная сістэма, а для пастаянных магнітаў намі прыменен новы сплаў «магніко», што дазволіла без пагоршання якасці гучнагаварыцеля паменшыць вагу магніта ў некалькі разоў.

У прыёмніку маюцца ўнутраная ферытавая антэнка, лямпы пальчыкавай серыі, клавішны пераключацель дыяпазона і многія іншыя ўдасканальванні.

Нягледзячы на прымяненне ў нізкачастотным тракце прыёмніка пяці гучнагаварыцеляў для аб'ёмнага гучання і дабаўлення ў прыёмнік новага ўльтра-кароткага дыяпазону, нам удалося паменшыць вагу прыёмніка «Беларусь-57» у параўнанні з прыёмнікам «Беларусь-53» на 20 кг.

Калектыў канструктараў нашага завода працуе над паляпшэннем тэлевізійных прыёмнікаў, а таксама над укараненнем новых канструкцый вузлоў (у прыватнасці, распрацоўваецца тораідальны трансфарматар і машына для яго вырабу) і тэхналагічных канструкцый.

Нягледзячы на дасягнутыя поспехі мы яскрава ўяўляем сабе, што зробленае намі з'яўляецца толькі пачаткам, што многае нам патрэбна яшчэ зрабіць, каб выправіць існуючыя недахопы. У працэсе вытворчасці ўзнікаюць пытанні і задачы, у справе вырашэння якіх павінны прыняць удзел студэнты, прафесарска-выкладчыцкі састаў фізіка-матэматычнага факультэта БДУ.

Як мы ўжо адзначалі, у магнітнай сістэме нашых гучнагаварыцеляў выкарыстоўваецца новы магнітны сплаў «магніко». У гэтым сплаве прымяняюцца такія металы, як электралітычная медзь, нікель, хімічна чысты алюміній, кобальт, а таксама жалеза маркі «Армко».

Патрэба ў магнітах вылічваецца сотнямі тысяч штук. Кожны грам эканоміі вагі магніта дае вялікі эканамічны эфект. У нас на заводзе не вырашаны пытанні, як лабараторных, так і цэхавых кантрольна-вытворчых магнітных вымярэнняў. Не вырашан рад тэхналагічных пытанняў з ліццём магнітаў са сплава «магніко».

Тут вялікае поле дзейнасці, і мы з задавальненнем адзначаем, што студэнт БДУ т. Будзько ў сваёй дыпломнай рабоце займаецца магнітнымі вымярэннямі, якія будуць пастаўлены ў нас на заводзе.

Калектыў інжынерна-тэхнічных работнікаў нашага завода заклікае студэнтаў, выкладчыкаў і прафесараў БДУ ўмацоўваць сувязь навукі з вытворчасцю, а, у прыватнасці, у сваіх даследаваннях распрацоўваць тыя пытанні, якія ўзнікаюць на нашым прадпрыемстве. Сумесная работа можа даць значны эканамічны эфект і дапаможа нашаму заводу ўзняць культуру вытворчасці і дасягнуць яшчэ лепшых паказчыкаў у сваёй рабоце.

Ад імя калектыва радыёзаводцаў,
**В. Н. ПУМПЯНСКІ,**
галоўны інжынер,
**Я. А. СЛЕПЯН,**
начальнік цэнтральнай лабараторыі.

## СА СВЯТАМ!

*8 сакавіка—Міжнародны жаночы дзень.*

*Разам з усімі адзначаць сваё свята і дзяўчаты нашага універсітэта.*

*Лілія Цунская прыехала ў БДУ з далёкага Усходу—з горада Комсамольска-на-Амуры. У яе заліковай*



*кніжцы толькі выдатныя і добрыя адзнакі. Паспяхова здала Лілія і зімнюю экзаменацыйную сесію.*



*— Дыпломную работу ўжо напісала,—гаворыць пяцікурсніца гістарычнага факультэта Соф'я Несціяровіч.—У гэтым годзе закончу універсітэт і пачну працаваць.*



*7 сакавіка Соф'я Чайкоўская (4 курс біяфака) здае экзамен.*

*—Здам паспяхова, тады і свята будзе радасным,—гаворыць яна.*

*8 сакавіка ўжо ўваходзіць у дзверы нашых вучэбных карпусоў, інтэрнатаў. Таму хочацца ад усяго сэрца павіншаваць нашых дарагіх дзяўчат і жанчын—студэнтак, лабарантак, навуковых і тэхнічных работнікаў з іх святам—Міжнародным жаночым днём.*

*Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.*

## Пытанні падрыхтоўкі спецыялістаў

Адбыўся сход комсамольскага актыву універсітэта. Асноўнае пытанне павесткі дня—падрыхтоўка маладых спецыялістаў. Выступіўшы з дакладам сакратар ЦК ЛКСМБ т. Бальшоў даў аналіз той вучэбнай і палітыка-выхаваўчай рабоце, якую праводзіць комсамольская арганізацыя універсітэта.

Вынікі зімняй экзаменацыйнай сесіі паказалі, што комуністы і комсамольцы ідуць у авангардзе калектыву студэнтаў, упарта авалодваюць ведамі. Але вучоба студэнтаў—а гэта асноўнае—да гэтага часу ўсё яшчэ не адпавядае патрабаванням. Аб гэтым сведчыць той факт, што 122 комсамольцы атрымалі ў зімнюю сесію нездавальняючыя адзнакі.

Адбыўшыйся ў снежні месяцы 1956 года III Пленум ЦК ЛКСМБ Беларусі адзначыў, што ў галіне вучобы і выхавання студэнтаў у комсамольскіх арганізацыях практыкуюцца няправільныя формы і метады работы.

Цэнтрам вучэбна-выхаваўчай работы павінна быць акадэмічная група. Між тым, камітэт комсамола універсітэта мала займаецца пытаннямі вучобы ў групах, не праводзіць ніякіх канкрэтных мерапрыемстваў, а самі студэнты-комсамольцы часта не могуць знайсці патрэбных форм работы.

Вельмі важным ў самастойнай працы студэнта з'яўляецца правільнае планаванне часу. Між тым, на некаторых факультэтах лекцыйныя гадзіны плануюцца дрэнна. Так, на другім курсе біёлага-глебавага факультэта заняткі пачынаюцца ў 10 гадзін раніцы і працягваюцца да 6 гадзін вечара. А чаму-б не пачынаць з 8 гадзін? Тады дзень не быў-бы разарваны і кожную гадзіну студэнты маглі-б выкарыстаць максімальна.

Комсамольскія арганізацыі павінны цікавіцца такімі пытаннямі і ставіць іх перад дэканатамі і рэктаратам.

Мала ўвагі ўдзяляецца ва універсітэце пытанням вывучэння педагогікі. У той час, калі ў педагагічных ВНУ на вывучэнне гэтага прадмета адводзіцца 120 гадзін, ва універсітэце — у два разы менш.

Недастаткова таксама для падрыхтоўкі поўнацэннага педагога і аднаго месяца практыкі. Асабліва карыснай была-б для студэнтаў практыка ў сельскіх школах, у якія яны паедуць працаваць. У нашых праграмах не прадугледжана дзіцячая тэхнічная і юнацкая творчасць, а з гэтым-жа малады педагог сутыкаецца з першых-жа дзён работы ў школе.

Важную ролю ў вучэбна-выхаваўчым працэсе адыгрывае вывучэнне соцыяльна-эканамічных дысцыплін. Недахопам тут з'яўляецца тое, што вывучаюцца яны абстрактна, па-кніжнаму, у адрыве ад жыцця. Студэнты іншы раз не могуць выкарыстоўваць палажэнняў марксісцка-ленінскай тэорыі ў прымяненні да сучасных падзей. Вялікае зло прыносіць і тое, што спрэчкі па вострых палітычных праблемах вядуцца не ў аўдыторыях на семінарах, а ў калідорах. Некаторыя выкладчыкі замест змястоўнага адказу на пастаўленае пытанне адмоўчваюцца.

Наша пакаленне вырасла ва ўмовах пабудовы соцыялістычнага грамадства. Таму мы часта забываем аб тых цяжкасцях, якія пераадольваліся нашымі бацькамі. А гэта заўсёды трэба мець на ўвазе, кожны раз напамінаць аб гэтым і тым самым змагацца з пранікненнем у наша асяроддзе буржуазнай ідэалогіі.

Большасць выступіўшых у спрэчках спынілася на пытанні політэхнічнага навучання студэнтаў. Аб гэтым вядуць размову не ўпершыню. Але да гэтага часу амаль нічога не зроблена ў гэтым напрамку. Ва універсітэце няма вытворчых майстэрняў. Нашы студэнты не ведаюць, як падыйсці да станка, у той час, калі навучэнцы школ свабодна працуюць на іх. Аб гэтым гаварылі ў сваіх выступленнях комсамольцы Нікалаеня, Тачыцкі (фізіка-матэматычны факультэт).

Сакратар комсамольскай арганізацыі біёлага-глебавага факультэта т. Сушчэня спыніўся на практычнай падрыхтаванасці студэнтаў да практычнай работы ў школе.

— Многа рознастайных курсаў—глебазнаўства, расліназнаўства і г. д.—чытаюць на нашым факультэце,—гаворыць т. Сушчэне. Ніякіх практычных навыкаў яны не даюць. Амаль ніхто са студэнтаў не ўяўляе сабе жывёлагадоўчай фермы. Расліны мы вывучаем толькі па кнігах.

Комсамольцы Жукаборскі (геолага-геаграфічны факультэт) і Дзянісава (фізмат) гаварылі аб неабходнасці паляпшэння комсамольскай работы ў акадэмічных групах.

Трэба менш засядаць, а больш рабіць. Пад такім лозунгам прайшоў сход комсамольскага актыву.

**М. ВАЦІС.**

Партыйнае жыццё

## У ПАРТЫЙНЫМ КАМІТЭЦЕ БДУ

Партыйны камітэт універсітэта заслухаў пытанне аб рабоце рэдкалегій «Навуковых бюлетэняў» біёлага-глебавага і філалагічнага факультэтаў.

Партком станоўча ацаніў работу рэдкалегіі «Навуковага бюлетэня» біёлага-глебавага факультэта (рэдактар В. П. Дуброва).

Рэдкалегія за прайшоўшае паўгоддзе выпусціла 5 нумароў бюлетэня. На старонках бюлетэня асвятляліся пытанні навукова-даследчай работы вучоных, аспірантаў і студэнтаў факультэта, друкаваліся рэцэнзіі і анатацыі на друкаваную прадукцыю. Спецыяльны артыкул прысвечан абмеркаванню плана навуковай работы факультэта на 1957 год. Бюлетэнь прыводзіць много цікавых фактаў з даследаванняў работнікаў факультэта.

Актыўнымі карэспандэнтамі бюлетэня з'яўляюцца акадэмікі Годнеў і Турбін, прафесары, доктары навук, загадчыкі кафедрамі. У артыкулах абмяркоўваецца і крытыкуецца навуковая работа членаў кафедраў, лабарантаў, студэнтаў, даецца крытыка работы асобных членаў СНТ. Ёсць рад справядлівых заўваг у адрас грамадскіх арганізацый за тое, што яны непрадумана рэкамендуюць кандыдатаў у члены СНТ.

Надзвычай цікавыя карэспандэнцыі аб практыцы студэнтаў. Бюлетэнь двойчы за прайшоўшае паўгоддзе асвятляў пытанне аб ходзе выканання студэнтамі дыпломных і курсавых работ.

У асвятленні работы гурткоў друкуюцца не толькі агульныя звесткі, атрыманыя ад загадчыкаў кафедрамі, аб ліку пасяджэнняў гурткоў і колькасці прачытаных дакладаў, але і аналізуецца методыка правядзення заняткаў, сам працэс іх, вопыт. Студэнт Ю. Сапажэнкаў, напрыклад, прапануе ў дні работы гурткоў скараціць лекцыі.

Добрае афармленне бюлетэня. Мова пісьменная. Загалоўкі трапныя і выразныя. Ёсць цікавыя фотаілюстрацыі. Але іх, нажаль, мала.

Інакш абстаіць справа з работай рэдкалегіі «Шлях у навуку»—органа навуковых работнікаў і СНТ філфака (рэдактар А. А. Лойка).

За сем прайшоўшых месяцаў навучальнага года выпушчан толькі адзін нумар бюлетэня.

У артыкуле «Вышэй узровень работы гурткоў» дадзен павярхоўны і далёка не поўны пералік, якія гурткі працуюць, якія не. У другім артыкуле на гэтую-ж тэму «Вывучайце фальклор» горача і правільна сказана аб значэнні народнай творчасці, але няма ніводнага слова аб тым, што зроблена ў гэтым гуртку. У падборы цытат з рэцэнзій на студэнцкія работы пад загалоўкам: «Вытрымкі без каментарыяў, або як не трэба пісаць» незразумела, хто маецца на ўвазе—студэнты або рэцэнзенты. Ёсць у нумары артыкул і пад такой назвай. «З большага аб дакладзе» (?!)

Увогуле, мова, вёрстка і афармленне навуковага бюлетэня філфака неахайныя і малапісьменныя.

Партком абавязаў партыйнае бюро філфака тэрмінова наладзіць культурны выпуск органа навуковых работнікаў і СНТ філфака «Шлях у навуку».

**І. В. ГУТАРАЎ,**
**член парткома.**

## У абстаноўцы рэзкай крытыкі

Па-дзелавому абмеркавалі комуністы філфака даклад дэкана факультэта прафесара М. Г. Ларчанкі «Аб выніках зімняй экзаменацыйнай сесіі і задачах на другі семестр 1956-57 навучальнага года».

Выступіўшыя ў спрэчках тт. Бірала, Зімак, Малашка, Кац, Булацкі і другія адзначылі, што сесія прайшла на больш высокім ідэйна-педагагічным узроўні, чым у папярэднія гады. Але побач з гэтым комуністы спыніліся на радзе сур'ёзных недахопаў.

Былі выпадкі, калі студэнты здавалі па некалькі залікаў у адзін дзень. Асобныя выкладчыкі не зусім аб'ектыўна ацэньвалі веды экзаменуючыхся. Некалькі крытычных заўваг было выказана ў адрас кандыдата навук Н. Н. Багалюбавай.

На сходзе гаварылася таксама, што не зусім добра абстаіць справа з наведваннем лекцый. Асабліва на IV курсе аддзялення журналістыкі. Нягледзячы на тое, што на курсе займаюцца чатыры комуністы, дысцыпліна знаходзіцца яшчэ на нізкім узроўні. Дастаткова сказаць, што за апошні семестр не было праведзена ніводнага сходу групы.

Па абмеркаванаму пытанню комуністы прынялі рашэнне, накіраванае на ліквідацыю маючыхся недахопаў і паляпшэнне вучэбна-выхаваўчай і палітыка-масавай работы на факультэце.

**Н. БАРАВЫ.**

## Выкладчыкі і студэнты

Ітак, выбар зроблен. Пасля доўгіх роздумаў і хістанняў малады чалавек паступае ва універсітэт. У студэнцкія гады, не менш чым у школьныя, патрэбен вопытны кіраўнік і сябра. З аднаго боку, гэтую ролю можа выканаць калектыў. Але калектыў—гэта сума людзей такіх-жа, ня вопытных, многія з якіх не зусім яшчэ добра разумеюць, што такое дрэнна, а што—добра. Таму самую вялікую ролю ў выхаванні студэнцтва адыгрывае выкладчык.

...Даўно ўжо празвінеў званок, а студэнты ўсё яшчэ сядзяць нерухома—так захапіла іх лекцыя Давіда Еўсеевіча Фактаровіча аб Ібсене. Багатая зместам, яна падаецца мовай, поўнай прыказак, параўнанняў, пагаворак. Такія лекцыі не праходзяць бясследна—яны абуджаюць думкі, заклікаюць да працы.

Д. Е. Фактаровіч не толькі добры лектар, але і выхавацель. Пасля заняткаў ён можа зайсці ў інтэрнат, пагутарыць са студэнтамі аб іх жыцці, вучобе, і так проста, што міжволі шчыра раскажаш яму ўсё.

Такіх выкладчыкаў нямала.

Студэнты для іх не бязлікая маса слухачоў, а перш за ўсё—будучыя будаўнікі комуністычнага грамадства. Такія выкладчыкі ведаюць, што студэнты павінны выйсці ў жыццё высокакваліфікаванымі людзьмі. Веды, якія атрымоўваюць студэнты ў БДУ, павінны быць не мёртвым капіталам, а іх перакананнямі. Адсюль і вялікае жаданне прачытаць лекцыю так, каб яна дайшла да студэнта, адсюль і ўвага да кожнага асобнага студэнта, адсюль і павага да іх. А ў сваю чаргу—і павага студэнтаў да сваіх выкладчыкаў. Ім давяраюць, іх слухаюць, на занятках у іх заўсёды парадак.

Студэнты, якім даводзілася слухаць лекцыі А. Н. Сторажава, у адзін голас заяўлялі:

—Толькі дарэмна час губім.

Мала добрага можна сказаць аб лекцыях такіх выкладчыкаў, як т.т. Кавалёва, Бірала і некаторыя іншыя. Як правіла такія выкладчыкі не вядуць выхаваўчай работы сярод студэнтаў.

— Ды і што студэнты, дзеці малыя? Ім нянькі патрэбны?—разважае Сямён Львовіч Дорскі—кіраўнік адной з студэнцкіх груп.

Нянькі, вядома, не патрэбны, а кіраўнікі—абавязкова.

Студэнт імкнецца ведаць усё. Гэта добра. Але патрэбна, каб ён разумеў правільна, правільна прымяняў свае веды на практыцы. Сустрэў, напрыклад, студэнт, у кнізе незразумелы выраз. Калі ён звернецца за растлумачэннем да І. В. Гутарава, Ц. А. Базылева і іншых выкладчыкаў, яны падрабязна растлумачаць усё няяснае. А С. Л. Дорскі мала цікавіцца пытаннямі студэнтаў і не жадае адказваць на іх.

М. І. Жыркевіч, Д. П. Багрова і многія іншыя выкладчыкі дапамогуць групоргу скласці план работы, правесці комсамольскі сход. Ад іх увагі не пройдзе ні захапленне «стылем», ні дрэнныя паводзіны студэнта. Усё гэта складае для іх палітыка-выхаваўчую работу ў групе, работу без падмену ініцыятывы актыву, а толькі ўмелае кіраўніцтва ім.

У Сямёна Львовіча Дорскага са студэнтамі сваёй групы «шапачнае» знаёмства. У мінулым годзе ён ні разу не бываў на групавым комсамольскім сходзе. У гэтым-жа—за ім замацавалі першы курс аддзялення рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта. Прыйшоў ён аднойчы ў групу. Студэнты адразу-ж усе свае пакуты выклалі: расказалі аб цяжкім матэрыяльным становішчы асобных студэнтаў, аб тым, што неабходна ўпарадкаваць расклад заняткаў. Сямён Львовіч усё гэта акуратна запісаў у свой блакнот, паабяцаў дапамагчы і знік. Нават палец аб палец не ўдарыў, каб выканаць абяцанае. Народная прыказка гаворыць: «Падвядзеш раз—не павераць у другі». Так і тут.

Не ведае С. Л. Дорскі студэнтаў сваёй групы. Праўда, ён завярае:

— Я іх усіх ў твар ведаю!

Падазрона, безумоўна, але паверым яму. Толькі ці напісана на твары, што прадстаўляе з сябе малады чалавек? Ці не ў гэтым цэзараўскім метадзе работы «прыйшоў, убачыў, перамог» скрываецца прыклад таго, што кожны год у Сямёна Львовіча «цяжкія групы», што ўжо зараз на першым курсе паявіліся нездаровыя настроі?

Ёсць ва універсітэце добрыя выкладчыкі, ёсць і дрэнныя, добрыя студэнцкія групы, і дрэнныя. Нам здаецца, што гэта залежыць ад таго, як змог выкладчык разам з комсамольскім актывам наладзіць работу. Які ўплыў аказваў ён асабіста на студэнтаў і, нарэшце, з якой добрасумленнасцю працаваў з імі.

Пяць год, пяць самых цудоўных год праводзіць студэнт ва універсітэце. Потым—праца. Але ніколі не забудуцца ўспаміны аб студэнцкіх днях. І самымі яркімі вобразамі павінны быць вобразы прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў, якія вучылі не толькі мудрасці навукі, але і жыць, працаваць, змагацца.

**А. ГЕРУС,**
**намеснік сакратара комсамольскага бюро філфака.**

# „Ці ёсць у нас таленты"

У файэ Палаца культуры профсаюзаў грымела музыка, танцавала моладзь, а глядзельная зала была ўжо даўно занята студэнтамі. З нецярплівасцю чакалі пачатку канцэрта. Сёння-ж сатырычны агляд.



*Ідзе радыёрэпартаж «Жывем мы весела сягоння, а заўтра будзем весялей».*

Нарэшце, папаўзла заслона і...

— Працягваем наша 37-е пленарнае пасяджэнне па выпрацоўцы мерапрыемстваў для стварэння эстраднага агляду.

Такім чынам, пачынаецца сатырычны агляд, напісаны студэнтамі аддзялення журналістыкі Э. Калядэнка і Г. Кузьмічэнка і пастаўлены кіраўніком драматычнага калектыву С. Г. Новакам.

Аўтары знайшлі вельмі цікавую форму, форму тэлевізійнай перадачы. Прыцягвае і жанравая рознастайнасць агляду: тут і радыёрэпартаж, і канферанс, сцэнкі са студэнцкага жыцця, музычныя нумары, кінофільм.

Форма ў асноўным адпавядае зместу. Гэта наша, студэнцкае жыццё. Вось чаму так актыўна рэагуюць гледачы. Даўно знаёмыя эпізоды па-новаму ўспрыймаюцца студэнтамі. Ад душы смяюцца тыя, у каго чыстае сумленне, многія з падазронасцю азіраюцца: ці не з іх гэта смяюцца. Але пакінем на мінуту глядзельную залу. Звернемся да агляду. Добра сустракае глядач салістак Шытохіну і Мігуру. Аднак Мігура не выкарыстоўвае ўсіх магчымасцей свайго багатага голасу. У якойсьці меры ёй не хапае жвавасці, артыстычнай мімікі, лепшага кантакту з залай.

Змест агляду—студэнцкія справы. Колькі гумару і непадкупнай весялосці ў лепшай сцэне агляду — радыёрэпартажы «Жывем мы весела сёння, а заўтра будзе весялей». Бурнымі апладысментамі ўзнагароджаны вядучыя Калядэнка і Кузьмічэнка, аспірант Тамільчык, які выконваў ролю прафесара-шарлатана, пралезшага ў навуку на «шэранькім козліку». Аднак тэкст гэтай сцэны вельмі слабы, можна сказаць, прымітыўны і плоскі.

Гул адабрэння пракатваецца па зале з паяўленнем Г. Герасіменкі (паэт Прыспасабленскі). Вельмі ўдала прачытаў ён вершы (аўтар Г. Бураўкін) з цыкла «Заводская, лесанарыхтоўчая, аграрная і профсаюзная лірыка».

Вельмі займальнай аказалася і ідэя стварэння універсітэцкага фільма. Знят фільм «Зламыснік» (амаль па Чэхаву). Але «Зламыснік» не гучыць поўнасцю таму толькі, што аўтары, узяўшы форму чэхаўскага дыялага, спрабуюць падрабіцца і пад яго стыль.

— Я думаю, што ўжо можна закругляцца і запісаць у пратакол вынікі нашых дэбатаў. Таму ў параграф № 1 трэба ўнесці, што эстрадны агляд... Якая будзе думка наконт ацэнкі апошняга?»

Можна прызнаць першы вопыт канцэрта-агляду добрым. Мы думаем, што ўсе з намі згодны.

Але скажам яшчэ аб некаторых недахопах. Галоўны з іх — расцягнутасць за лік многаслоўнага канферансу, які часта пазбаўлен вастрыні, гумару Калядэнка і Кузьмічэнка адмовіліся ад выканання сатырычных куплетаў. Гэта-б унесла рознастайнасць і не так яскрава кідалася-б у вочы павучальнасць канферансу. Вельмі ўжо прыеліся і прозвішчы, якія заўсёды ўпамінаюцца ў іх выступленнях (Жарскі, Марчанка, Герасіменка).

Аўтарам трэба пазбягаць і двухсэнсоўнасці некаторых выразаў, напрыклад, (Дзяўчына: Усё роўна ён (універсітэт) з усіх бакоў аднолькавы»).




*Сцэнка абароны дысертацыі аб шэранькім козліку. (У ролі прафесара Леў Тамільчык).*

Трэба спадзявацца, што ў Калядэнкі і Кузьмічэнкі ў хуткім часе паявяцца паслядоўнікі. Студэнцкае жыццё даволі шматграннае. Многа ў ім добрага, але многа і недахопаў. Выносьце іх на суд грамадскасці. Абмяркуем і пасмяемся разам.

Г. ІВАНОВА.

## У НАШЫХ СЯБРОЎ

**Моладзь усяго свету рыхтуецца зараз да свайго свята—фестывалю. Усюды праводзяцца цікавыя вечары, сустрэчы, балі і маскарады. Кожны жадае зрабіць да гэтага дня нешта новае, незабыўнае.**

**Сёння мы раскажам аб тым, як рыхтуюцца да фестывалю юнакі і дзяўчаты некаторых гарадоў Совецкага Саюза.**

### ПЕТРАЗАВОДСК

**Нечакана на Онежскім возеры ўбачылі прыгожую кананерскую лодку. Да берага прычалілі на шлюпках члены гарадскога фестывальнага клуба. Яны прывезлі канцэрты самадзейнасці, цікавыя гутаркі, новыя песні.**

**Кожны такі рэйс кананеркі папаўняў клуб новымі ўдзельнікамі—вельмі дапамагала своеасаблівае, рамантычнае афармленне паездак.**

### ОДЭСА

**У Одэсе створаны «Клуб займальных сустрэч», «Клуб дзяўчат», клуб «Вакол свету» і іншыя.**

**Адным з самых цікавых мерапрыемстваў «Клуба займальных сустрэч» была сустрэча маладажонаў. (Разведзеным уваход сюды быў забаронен!). Вечар адкрыўся ўступленнем у шлюб Жэмчужына і Макавейчук. Яны распісаліся ў кнізе запісаў актаў грамадзянскага стану, і сведкамі былі не двое і не трое, а цэлы натоўп юнакоў і дзяўчат, якія шчыра жадалі ім шчасця. Павіншавалі іх і тыя, хто адсвяткаваў залатое і сярэбранае вяселле.**

**Гэты клуб правёў ужо больш 20 сустрэч. Вельмі памятны Дзень рыбалова—свята на вадзе: лавілі рыбу, варылі юшку, а вечарам узбярэжжа засвяцілася кастрамі.**

## Набыў ты латарэйныя білеты?

**У латарэі разыгрываюцца аўтамабілі «Волга», «Масквіч», матацыклы, веласіпеды, фотаапараты, часы, піяніна, акардыёны, тэлевізары, радыёпрыёмнікі і іншыя рэчы.**

*Латарэйныя білеты маюцца ў камітэце комсамола універсітэта.*

# Фестывальная старонка

## Фестывальная эстафета

*Таварышы студэнты! З гэтага нумару мы пачынаем весці фестывальную эстафету. Комсамольскія актывісты, кіраўнікі факультэцкіх фестывальных камітэтаў раскажуць, як рыхтуюцца студэнты да сваіх факультэцкіх фестываляў.*

*Эстафету пачынаюць студэнты хімічнага факультэта і перадаюць яе матэматыкам. У наступным нумары нашай газеты студэнты фізіка-матэматычнага факультэта раскажуць аб сваіх справах, аб тым, што цікавае прыдумалі яны, рыхтуючыся да свайго свята.*

## ГАВОРЫЦЬ ХІМФАК

Няма такіх правіл, па якіх можна было-б праводзіць факультэцкія вечары, фестывалі. Ёсць толькі адна неабходная запаведзь: на свяце маладосці павінна быць многа весялосці, смеху, жартаў, танцаў. Мы добра засвоілі гэтае патрабаванне, таму імкнемся арганізаваць наш факультэцкі фестываль як самае вясёлае маладзёжнае свята. Наш фестываль будзе праходзіць у памяшканні хімічнага корпуса універсітэта 24 сакавіка. Мы прыкладзем усе намаганні, каб гэты дзень прайшоў урачыста, святочна. Комсамольскія групы падрыхтуюць да гэтага дня малюнічыя плакаты, амаль кожная група рыхтуе па 1—2 масавыя гульні (кіраўнік Люба Алукер). Першая група 3 курса зробіць каляровыя лямпачкі, другая і трэцяя групы 2 курса—флажкі ,шары. Нашы студэнты Ігар Сакольчык і Леанід Скрыпко рыхтуюць вясёлы канферанс.

Мы мяркуем правесці спартыўныя спаборніцтвы: выступяць нашы лепшыя спартсмены А. Сак, Т. Шут, А. Окалава, А. Стук, Л. Гурыновіч, Р. Белякова, Н. Плюшчэўскі, Ю. Пралескоўскі. Правядзем сяброўскія сустрэчы паміж курсамі па валейболу, баскетболу, спартыўныя выступленні па гімнастыцы, акрабатыцы, фехтаванню.

Да свайго свята мы рыхтуем невялікую п'еску, масавыя і сольныя танцы, песні, музычныя нумары.

Да факультэцкага фестываля выпусцім фотогазету, прыдумаем свае фестывальныя значкі, касцюмы. Зробім усё, каб наш фестываль быў вясёлым і незабыўным святам.

**С. МЯЧКОЎСКІ,
К. НЯЛІДАВА.**

## Спявае хор БДУ

Далёка за сценамі універсітэта вядомы наш студэнцкі хор. Ён часта з поспехам выступаў не толькі перад студэнтамі БДУ, але і перад грамадскасцю горада. Ён неаднаразова заваёўваў першынство на рэспубліканскіх аглядах мастацкай самадзейнасці, у ліпені 1956 года ўдзельнічаў у I студэнцкім Свяце песні ў Тарту, дзе сабраліся лепшыя студэнцкія харавыя калектывы Ленінграда, Кіева, Рыгі, Таліна, Петразаводска і іншых гарадоў.

Складаны і цікавы рэпертуар, добрае выкананне,—вось што прыцягвае сімпатыі слухачоў да універсітэцкага хору.

Выкананне хорам цудоўнага твора Шэбаліна на словы Пушкіна «Зімняя дарога» і віртуознай народнай песні—пляскі «Тульяк», беларускіх народных песень—заўзятай, вясёлай «Пайду, пайду, Ясю мілы» і поўнай смутку і журбы «Ой, на гары пшанічанька», песні самадзейнага кампазітара Шыдлоўскага «Чорныя вочкі» заўсёды выклікае гарачае адабрэнне. Але наўрад ці задумваецца хто, якая вялікая праца затрачваецца на тое, каб дабіцца чысціні гучання, зладжанасці ў харавых партыях. Колькі цярпення і сіл патрачана калектывам хора, каб тая ці іншая песня была адпрацавана так, як належыць.

Калісьці, чатыры—пяць год назад, хор выконваў простыя, двухгалосыя творы. Зараз хор перайшоў цалкам на акапельную праграму, узрасло майстэрства выканаўцаў

Хор нашага універсітэта падтрымлівае цесныя сувязі са студэнцкімі калектывамі краіны, у прыватнасці з харавой капэлай Кіеўскага політэхнічнага інстытута. Па запрашэнню ўкраінскіх студэнтаў наш хор наведае Кіеў. У сувязі з падрыхтоўкай да паездкі туды і да фестывалю моладзі хор зараз працуе асабліва старанна. Удасканальваюцца песні, якія выконваліся раней, развучваецца рад новых твораў народаў СССР і зарубежных краін—«Лявоніха» у новай складанай апрацоўцы, «Вальс мінскіх студэнтаў» Юрыя Семенякі, амерыканская народная песня «Тры раніцы», чэшская песня «Міма поля» і іншыя. Будзе падрыхтавана некалькі ўкраінскіх песень. Калектыў упэўнены, што хор здолее заняць не апошняе месца сярод самадзейных калектываў краіны і зробіць усё магчымае, каб дабіцца права на паездку ў Маскву адстайваць там гонар беларускіх студэнтаў.

**Г. КЛЕБАНАЎ.**

## У НАШЫХ СЯБРОЎ

### МАСКВА

**Пры фестывальным камітэце Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава арганізаваўся маладзёжны творчы клуб. Мэта яго—аб'ядноўваць усе творчыя сілы моладзі універсітэта. Бліжэйшая задача—падрыхтоўка і правядзенне фестывалю.**

**У клубе створаны: літаратурнае аб'яднанне, секцыі падрыхтоўкі і правядзення баляў, маскарадаў, вечароў, секцыі мастакоў, фатаграфіі, карнавальных касцюмаў і фестывальных мод, кіностудыя.**

### КАЛІНІНГРАД

**Гарадскі фестывальны клуб арганізаваў баль кветак. Замест білета—кветкі: яны прадаваліся ля ўвахода. У выніку—прыгожа і незвычайна, а грошы ад кветак—на патрэбы клуба.**

**Калінінградскія комсамольцы прымусілі працаваць на фестываль нават авіяцыю. У дні абласных, раённых фестываляў самалёты скідвалі фестывальныя лістоўкі—гэта прыдае святам асаблівую ўрачыстасць.**

* * *

**Дарагія сябры! А што можам зрабіць мы, каб фестываль нашага, Беларускага універсітэта, прайшоў таксама ярка, урачыста, святочна, з аганьком, каб гэты дзень запомніўся на ўсё жыццё?**

**Чакаем вашых адказаў і прапаноў!**



*Баскетбалісты рыхтуюцца да летніх сустрэч.*

## Фізкультура і спорт

# Час наладзіць работу!

***(спартыўная работа на юрыдычным факультэце вядзецца нездавальняюча)***

У Беларускім універсітэце зарадзілася добрая традыцыя—праводзіць круглагадычныя спартакіяды па розных відах спорту. Залік спартакіяды комплексны—агульнае месца факультэта вызначаецца па выніках каманд па ўсіх відах спорту. Спартакіяды з'яўляюцца аглядам і праверкай стану спартыўнай работы на факультэтах. І калі з гэтага пункту гледжання ацаніць выступленні на спартакіядах спартсменаў юрыдычнага факультэта, то ім хваліцца амаль няма чым. Ніводнага разу за апошнія чатыры гады юрфак не выходзіў пераможцай Спартакіяды ў комплексным заліку і нават не быў у ліку прызёраў, нягледзячы на тое, што асобныя каманды факультэта выступалі даволі паспяхова. Так, на 4-ай круглагадычнай Спартакіядзе БДУ ў 1956 годзе лёгкаатлеты юрфака занялі 3-яе прызавое месца ў асеннім кросе, паспяхова выступілі тады-ж і мужчыны-баскетбалісты. Але ў цэлым факультэт заняў на спартакіядзе перадапошняе, 6 месца.

Чым-жа гэта тлумачыцца? Прычын тут даволі многа. І найбольш важная з іх—адарванасць факультэта ад галоўных спартыўных баз універсітэта і саўпадзенне часу заняткаў на факультэце з работай агульнауніверсітэцкіх спартыўных секцый. Таму часта атрымоўваецца, што спартсмен задумваецца, куды яму пайсці—на лекцыі, або на заняткі спартыўнай секцыі. Зразумела, што такі выбар нежаданы. Спорт не павінен перашкаджаць вучобе. Кіраўніцтву факультэта трэба сур'ёзна задумацца над гэтым пытаннем і вырашыць яго так, каб спартсмены маглі свабодна наведваць спортсекцыі.

Пры факультэце ёсць свая спартыўная «база»—спортзал для заняткаў баскетболам, валейболам і штангай і «раздзявалка» (у ёй з вялікай цяжкасцю памяшчаецца 3—4 чалавекі). А калі-ж на трэніроўку прыходзіць цэлая каманда, то на пераадзяванне ўходзіць больш часу, чым на трэніроўку.

У мужчынскай велейбольнай камандзе налічваецца 13 спартсменаў, у баскетбольнай—9. Абедзве жаночыя секцыі—валейбольную і баскетбольную наведвае аднолькавая колькасць чалавек—9. Ці выпадковае гэта супадзенне? Не. Як не дзіўна, але ў абодвух секцыях займаюцца адны і тыя-ж спартсменкі.

Слабае выступленне спартыўнага калектыву юрыдычнага факультэта на 4 круглагадычнай спартакіядзе тлумачыцца і тым, што факультэт не змог выставіць жаночыя каманды па валейболу і баскетболу і поўную каманду па фехтаванню. Кіраўнікі спартыўнай работы на факультэце тлумачаць гэты факт малым працэнтам дзяўчат-студэнтак на факультэце. Гэта часткова правільна, але пры жаданні трэнераў нават з тых дзяўчат, якія есць на факультэце, можна было-б сфарміраваць і выдатна падрыхтаваць жаночыя каманды.

Назіраюцца і такія малюнкі, калі трэнеры сутыкаюцца з прамым нежаданнем асобных студэнтаў займацца спортам. Прыкладам можа служыць адказ студэнткі Л. Міцкевіч займацца валейболам, хаця пры ўпорных трэніроўках яна зможа даць добрыя вынікі.

Масавасць — аснова нашага спорту, яго поспехаў. Гэта зразумела кожнаму. А вось на юрыдычным факультэце спортам рэгулярна займаецца толькі 34 працэнты з агульнага ліку ўсіх студэнтаў факультэта. Так, у 1956 годзе на факультэце падрыхтавана 4 спартсмены II разраду, і 24—111. Гэта, зразумела, нядрэнна, але для факультэта, на якім займаецца каля 400 студэнтаў,—мала.

У мінулым годзе на факультэце выходзіла спартыўная газета «За масавы спорт». Цяпер-жа яе няма. Насценная газета «Савецкі юрыст» зусім не асвятляе спорт на факультэце. Спартыўны стэнд «Нашы спартыўныя дасягненні» афармлены дрэнна—выстаўлены толькі 2 дыпломы, заваёваныя ў ...1955 годзе. Непрыемнае ўражанне пакідаюць і табліцы норм ГТО 1 і 2 ступені, якія вывешаны ў вестыбюлі факультэта. Яны ўжо даўно пачарнелі ад пылу і часу. Над стэндам «Спорт на факультэце» прыгожы лозунг заклікае: «Савецкае студэнцтва! Змагайцеся за высокія дасягненні ў спорце!» Тут таварышам-юрыстам можна параіць заклікаць не толькі лозунгамі, але і справамі.

Ёсць на факультэце нямала спартсменаў, якімі па праву можа ганарыцца універсітэт. Гэта лепшы веласіпедыст факультэта Жданаў, капітан зборнай валейбольнай каманды БДУ А. Дудкін, члены зборнай каманды БДУ хакеісты В. Кісялёў, В. Пірожны, В. Максімаў, легкаатлет Гулякевіч, баскетбалісты А. Макарэвіч, А. Разанаў. Футбалісты факультэта складаюць касцяк зборнай каманды універсітэта.

Аднак ў спартыўнай рабоце на факультэце яшчэ многа недахопаў.

Спартыўны калектыў юрыдычнага факультэта (адказныя т. т. Рэцкі—выкладчык фізкультуры, Р. Каблянаў—старшыня факультэцкага камітэта ДСТ «Буравеснік» і Ю. Паршын—адказны за спартыўна-масавую работу на юрфаку) павінны прыняць усе меры, каб наладзіць спартыўную работу на факультэце і ў 5 круглагадычнай спартакіядзе БДУ заняць адно з першых месц.

**А. РАЗАНСКІ**

### Шахматны турнір БДУ

Зараз ва універсітэце праходзіць шахматны турнір на асабістае першынство сярод студэнтаў. У турніры ўдзельнічае 21 чалавек. Адбылося ўжо чатыры туры.

Без паражэнняў ідуць студэнт філфака Новікаў і студэнт геолага-геаграфічнага факультуэта Рысавец.

**НА ЗДЫМКУ:** Сустрэча студэнта 4 курса гістфака І. Арлова (справа) з пяцікурснікам кансерваторыі П. Пагоцкім.

Фото М. ПІЛЬШЧЫКАВА.



### ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

### *„Актывізаваць работу гуртка"*

Заметка, змешчаная пад такім загалоўкам у № 1 нашай газеты, была накіравана на рэагаванне на кафедру геалогіі.

Загадчык кафедры тав. Карулін паведаміў рэдакцыі, што матэрыял разбіраўся на пасяджэнні кафедры. Факты, прыведзеныя ў заметцы, правільныя. Прыняты меры па актывізацыі работы гуртка: перагледжан план дакладаў, расшырылася іх тэматыка, павялічыўся ўдзел выкладчыкаў у рабоце студэнцкага навуковага гуртка.

### *„Дапамажыце прыняць неадкладныя меры"*

У № 3 нашай газеты была змешчана пад такім загалоўкам заметка, у якой гаварылася аб тым, што ў адной з лабараторый хімічнага факультэта не створаны нармальныя ўмовы для працы.

Прарэктар па адміністратыўна-гаспадарчай рабоце Б. Н. Бярэзін паведаміў, што факты, аб якіх гаварылася ў заметцы, адпавядалі сапраўднасці. Лабараторыя пафарбавана ў светлы колер, усе недахопы, адзначаныя ў заметцы, ліквідаваны.

### Чытачы абмяркоўваюць артыкул

### „Зробім сваімі рукамі"

## *Гэта вельмі добрая прапанова*

*Работнікі чытальнай залы цалкам падтрымліваюць ініцыятыву студэнтаў III групы V курса гістарычнага факультэта. Мы лічам, што ў сучасны момант чытальная зала не забяспечвае самастойную работу студэнтаў.*

*Недастатковая плошча чытальнай залы перашкаджае плённай працы наведвальнікаў, таму што не хапае месца. Па гэтай прычыне многія чытачы-студэнты выносяць кнігі з чытальнай залы і не звяртаюць іх своечасова, а гэта ўносіць вялікі дысананс ў работу.*

*Неабходна таксама павялічыць кніжны фонд чытальнай залы. Гэта таксама звязана з памяшканнем. Для лепшага абслугоўвання студэнтаў нам трэба мець пры чытальнай зале пакой для кнігасховішча, а таксама для іх выдачы, таму што выдача кніг непасрэдна ў чытальнай залі парушае цішыню.*

*Нашымі агульнымі намаганнямі, сваімі рукамі мы павінны расшырыць наш універсітэт.*

*А. А. ЭВЕНЧЫК.*

## *Трэба неадкладна ўзяцца за працу*

*У артыкуле «Зробім сваімі рукамі», надрукаваным у газеце «Беларускі універсітэт» узнята вельмі важнае пытанне, ад вырашэння якога ў многім будзе залежаць паляпшэнне навуковай, культурна-масавай і спартыўнай работы ва універсітэце.*

*Пытанне аб злучэнні біялагічнага і хімічнага карпусоў ставілася кафедрай фізічнага выхаваня і спорту на пасяджэнні рэктарата, прыкладна два гады таму назад. І тады мы атрымалі поўную падтрымку. Патрабаваўся толькі дазвол архітэктурнага ўпраўлення на такую дабудову, аднак і да гэтага часу «праблема» злучэння двух карпусоў засталася невырашанай.*

*А гэта дало-б універсітэту значную плошчу, пашырыла-б спартыўную залу, у якой мы маем вострую патрэбу.*

*Наша спартыўная зала (14x13) не можа задаволіць нават трэніровачныя заняткі валейбольнай каманды, не гаворачы ўжо аб баскетбалістах. Адсутнасць нармальнай спартыўнай залы (30x32 метры) не дазваляе нам метадычна правільна будаваць заняткі па спартыўных гульнях) баскетболу, валейболу, ручному мячу), чым зніжаецца клас гульні нашых каманд.*

*Пры злучэнні двух карпусоў мы атрымаем спартыўную залу трыццаціпяцімятровай даўжыні. У такой зале магчыма будзе праводзіць заняткі нават па тэнісу і лёгкай атлетыцы.*

*Бяспрэчна, што студэнты з вялікім задавальненнем і радасцю папрацуюць на такой ударнай комсамольскай будоўлі і мы да 1 верасня будучага навучальнага года зможам атрымаць рад дадатковых памяшканняў, у тым ліку выдатную спартыўную залу, якая дасць магчымасць разгортванню масавага спорту ва універсітэце.*

*Е. МАРКАЎ,*

*загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.*

# У ПАДШЭФНЫМ КАЛГАСЕ

З вялікай радасцю сустрэлі калгаснікі сельгасарцелі «Комінтэрн» Дзержынскага раёна сваіх шэфаў—студэнтаў БДУ. Яны прыехалі, каб дапамагчы сваім сябрам наладзіць у калгасе агітацыйную і спартыўную работу, выпусціць перадвыбарчы нумар насценнай газеты, выступіць з канцэртам мастацкай самадзейнасці.

Вестка аб прыбыцці шэфаў хутка абляцела вёскі калгаса. Вечарам у праўленні арцелі сабралася моладзь. Завязалася цікавая гутарка... Многім цікавіліся студэнты: поспехамі калгаснікаў у працы, іх жыццём, культурна-масавай і спартыўнай работай. Сельскія працаўнікі расказалі, што іх калгас атрымаў у мінулым сельскагаспадарчым годзе даход у 1.140 тысяч рублёў. За апошні час у калгасе пабудаваны цагельны кароўнік, вялікі гараж, два свінарнікі. Зараз заканчваецца будаўніцтва аўчарніка і лазні. У кожным доме ўстаноўлены радыёкропкі. Сельскія юнакі і дзяўчаты з гонарам адзначылі, што добрабыт калгаснікаў расце з кожным днём.

Студэнты універсітэта Генадзій Кузьмічэнка і Рэм Ткачук расказалі калгаснікам аб Пастанове Пленума ЦК КПСС, аб працоўных поспехах сельскіх працаўнікоў брацкіх саюзных рэспублік.

Студэнт Воднеў сабраў вакол сябе комсамольскіх актывістаў і аматараў спорту. З гутаркі выявілася, што спартыўная работа ў калгасе запушчана. Тут-жа агульнымі намаганнямі былі намечаны канкрэтныя мерапрыемствы, якія павінны здзейсніць партыйная і комсамольская арганізацыі, каб ажывіць спартыўную работу ў калгасе. Воднеў перадаў сельскім спартсменам дзве партыі шашак, два мячы, спартыўныя плакаты дапамог старшыні нізавога спартыўнага совета многімі каштоўнымі парадамі.

Студэнты дапамаглі калгаснікам выпусціць цікавы нумар насценнай газеты. Асабліва ўдалым атрымаўся куток сатыры і гумару, які падрыхтаваў Э. Калядэнка. Ён-жа напісаў некалькі лозунгаў і зрабіў пераходны вымпел «Лепшай даярцы калгаса».

А на наступны дзень у Шабунеўшчынскай школе быў дан канцэрт мастацкай самадзейнасці. З вялікай увагай праслухалі калгаснікі выступленні студэнтаў Шытохінай, Недасекінай, Клебанава, Канапляніка, Бандарэнкі; асабліва цёпла былі сустрэты Калядэнка, Кузьмічэнка і Герасіменка.

Калгаснікі шчыра дзякавалі сваіх шэфаў за цікавы і змястоўны канцэрт.

Трэба адзначыць, што камітэт комсамола і прафком універсітэта не зусім уважліва аднесліся да падрыхтоўкі гэтай паездкі. Састаў агітбрыгады падбіраўся наспех. Праўленне калгаса не было загадзя паведамлена аб прыездзе шэфаў. Гэтыя недахопы неабходна ўлічыць, каб не паўтараць надалей.

**В. ВАЗАЎ.**

**Рэдактар А. ВОЛК.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19

АТ 09396 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 246 Тыраж 2000